**Шэдзько, А.** «Дзякуй калектыву за работу» / А. Шэдзько // Герой працы (Шуміліна). – 2022. – 12 жн. – С. 1.

**«ДЗЯКУЙ КАЛЕКТЫВУ ЗА РАБОТУ»**

Мне пашанцавала кіраваць такім калектывам, як Шумілінская ПМК-70, – падкрэслівае дырэктар Аляксей Крыўко. – З такімі надзейнымі людзьмі, якія ў нас працуюць, можна рэалізоўваць самыя смелыя планы. І хочацца сказаць проста дзякуй капектыву. Напярэдадні прафесійнага свята ад імя адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта віншую работнікаў і ветэранаў прадпрыемства і жадаю, каб у сем’ях ўсё было толькі выдатна, каб слёзы былі толькі ад радасці, а здароўе мацнела!».

Калі ёсць дасягненні, ёсць і прызнанне. Штогод прозвішчы лепшых работнікаў упрыгожваюць раённую Дошку гонару. Шумілінскія будаўнікі становяцца лаўрэатамі ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны». Так, па выніках мінулага года ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» прысвоена абліцоўшчыку-плітачніку Вячаславу Федзюку. На раённую Дошку гонару занесена прозвішча старшага вытворцы работ Аляксандра Багданава.



**На здымку** *(справа налева)*:А. Крыўко, В. Фядзюк і А. Багданаў.

**Аляксандр ШЭДЗЬКО.**